## *Ратуемся спадчынай*

✓**29 лістапада** ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася фотавыстава Марыны Бацюковай **«Мары Марыны. Мінск»**, прымеркаваная да 955-годдзя горада. Марына Бацюкова – удзельніца і куратар шматлікіх выстаў і праектаў у Беларусі і за мяжой, член Беларускага саюза мастакоў, Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў. Дынамічная, разнафарматная экспазіцыя паказвае беларускую сталіцу ў дробных дэталях і панарамным выглядзе. У кругавароце фотавобразаў – дзіцячыя ўспаміны, пырскі фантанаў, шум тралейбусаў, доўгія цені будынкаў, спякотнае лета і расколіны на асфальце пад пякучым сонцам сталіцы. Дапаўняюць панарамы горада мудрагелістыя формы каранёў-асацыяцый, якімі прасякнуты вуліцы, і дэталёвыя мініфатаграфіі будынкаў. Праз фотааб'ектыў уласнага ўспрымання аўтара Мінск паўстае горадам-марай, горадам, сатканым з гісторый і сноў.

Выстава арганізавана Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі сумесна з Беларускім саюзам мастакоў і будзе працаваць да 23 студзеня 2023 года.

✓**30 лістапада** ў Музеі беларускага кнігадрукавання ў Полацку пачала працаваць выстава **«Беларускі Дзюрэр»**, прысвечаная юбілею вядомага беларускага графіка Валерыя Славука. Тут паказана непаўторная графіка творцы, якая з'яўляецца самабытнай часткай беларускага кніжнага мастацтва. Валерый Славук шмат гадоў стварае запамінальныя вобразы персанажаў беларускай міфалогіі. Шырокую вядомасць набылі яго ілюстрацыі да народных казак «Удовін сын», «Піліпка-сынок», «Алёнка», а таксама да кніг «Айвенга» В. Скота, «Чорны млын» Ю. Брэзана, «Шляхціц Завальня...» Я. Баршчэўскага, «Вясна ўвосень» У. Караткевіча, «Чароўны свет», «Беларускі фальклор». За сваю працу мастак атрымаў вялікую




колькасць узнагарод, сярод якіх Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (2000), медаль Францыска Скарыны (2009), медаль «За заслугі ў выяўленчым мастацтве» (2010), ганаровае званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь» (2015). Пластычныя якасці ілюстрацый Валерыя Славука звязваюць яго творчасць з традыцыямі заходнееўрапейскай гравюры XVI ст., з-за чаго графіка называюць «беларускім Дзюрэрам». Гэтая акалічнасць і дала назву выставе. Прадметны рад заснаваны на прэзентацыі выданняў з ілюстрацыямі Валерыя Славука, а таксама графічных аркушаў яго аўтарства з фондаў НПГКМЗ.

Выставу можна наведаць да 5 лютага 2023 г.




✓**2 снежня** ў Мастацкай галерэі Полацка распачала працу **выстава скульптуры Сяргея Аганава**. Ён нарадзіўся ў сям'і вядомага беларускага скульптара навапалачаніна Льва Аганава, які ўбачыў у сыне талент і падтрымаў яго ў выбары свайго творчага шляху. Станаўленню Сяргея як скульптара высокага класа садзейнічала навучанне ў мастацкім вучылішчы імя А. К. Глебава і Беларускай акадэміі мастацтваў. На персанальнай выставе ў Полацку Сяргей Аганаў прапанаваў 25 станковых твораў скульптуры, выкананых ім за апошнія тры гады. У сваёй творчасці Сяргей звяртаецца да гістарычнай спадчыны Беларусі, а таксама да міфалагічных і рэлігійных сюжэтаў. Яго творы, на першы погляд, вылучаюцца стрыманасцю і лаканічнасцю формаў, але за гэтай сімвалічнасцю крыецца выразная мудрасць. Яго працы напоўнены красамоўнай маўклівасцю, якая пускае гледача ў філасофскія развагі.

Выстава працягнецца да 15 студзеня 2023 года.

✓**2 снежня** ў Гарадской выставачнай зале Жодзіна адкрылася персанальная мастацкая выстава заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Віктара Барабанцава **«Прастора маёй душы»**. Большасць прац, прадстаўленых на выставе, – пейзажы. Гэта вельмі актуальны жанр у сучасным жывапісе, паколькі дапамагае гледачу пашырыць гарызонты ўспрымання свету, выводзіць чалавека за цвёрдыя рамкі манатонных працоўных будняў гарадскога асяроддзя.




Выстава будзе дзейнічаць да 23 снежня.

✓З **1 снежня** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь працуе маштабны выставачны праект **«Чакайце нас, зоркі!»**. Адпраўной кропкай стварэння экспазіцыі сталі архіўныя фота- і відэаматэрыялы, плакаты савецкага часу, прысвечаныя космасу і развіццю навуковых тэхналогій, перыяду, калі гэтыя тэмы былі звязаны з актыўным рухам у новы свет навукі і тэхнічнага прагрэсу, а масавае захапленне космасам было часткай працэсу фарміравання мары аб светлай гуманістычнай будучыні. У экспазіцыі прадстаўлены работы вядучага касмічнага мастака СССР Андрэя Сакалова і касманаўта Аляксея Лявонава. Адзін з альбомаў іх творчага саюза – «Чакайце нас, зоркі!» – паслужыў назвай выставы. Касмічная тэма працягвае заставацца актуальнай і для сучасных аўтараў. Аднак іх погляд – гэта больш разважанні аб месцы чалавецтва ў вывучаным Сусвеце, аб неабходнасці сувымярэння чалавечай дзейнасці з законамі цэласнасці нашага агульнага дома – Зямлі, аб адказнасці чалавека перад сабой, прыродай і космасам. Асобная зала ў экспазіцыі працягвае архіўную тэму, даследуючы феномен захаплення ўсім паранармальным у познесавецкі перыяд. Кураторская група паспрабавала зірнуць на гэтыя ідэі з «цяперашняга», выкарыстоўваючы мову сучаснага мастацтва. Экспазіцыя праекта ўключае ў сябе плакаты, відэаарт, саўнд-арт, скульптурныя аб'екты, інсталяцыі, фотаздымкі, жывапісныя і графічныя работы. На выставе прадстаўлены творы з фондаў Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Музея-запаведніка Ю. А. Гагарына (Расійская Федэрацыя), Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Музея гісторыі горада Мінска, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, а таксама творы сучасных беларускіх аўтараў. У межах выставачнага праекта наведвальнікаў чакае насычаная суправаджальная праграма: экскурсіі, майстар-класы, адукацыйныя мерапрыемствы і прэзентацыі.

Выстава працягне сваю працу да 29 студзеня 2023 года ў будынку па вуліцы Някрасава, 3.

✓З **3** па **4 снежня** ў Мінску на базе Спартыўна-культурнага цэнтра Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прайшоў **Пяты Нацыянальны форум «Музеі Беларусі»**. Ён быў прысвечаны тэме «Музей. Спадчына. Памяць». Нагадаем, што Першы форум прайшоў у 2012 г. у Гродне, другі – у 2014 г. у Гомелі, трэці – у 2016 г. у Магілёве, чацвёрты – у 2019 г. у Брэсце. Сёлета ў форуме прынялі ўдзел больш за 80 дзяржаўных музеяў і галерэй, а таксама музейныя работнікі і міжнародныя эксперты. У рамках мерапрыемства была праведзена дзелавая праграма, што складалася з 4-х секцый: «Патрыятычнае выхаванне праз музейную дзейнасць», «Музей – тэрыторыя гістарычнай памяці», «Музей і спадчына», «Культура і побыт беларусаў» і круглага стала па развіцці культурна-пазнавальнага турызму. А таксама прайшоў конкурс прафесійнага майстэрства па намінацыях: «За лепшае прадстаўленне музея на экспазіцыі форуму», «За навацыі ў музейнай дзейнасці», «За лепшы музейны праект», «За лепшую культурна-адукацыйную праграму», «За лепшае музейнае выданне». Форум з'яўляецца адной з важных пляцовак для прэзентацыі музеяў і музейнай справы як важнага адукацыйнага і выхаваўчага рэсурсу грамадства, узбагачэння духоўнага патэнцыялу нацыі, а таксама ў мэтах прыцягнення ўвагі наведвальнікаў музеяў, сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікоў дзелавых колаў да музейнай справы.

*Скарыстаная інфармацыя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Музея беларускага кнігадрукавання ў Полацку, Мастацкай галерэі Полацка, Жодзінскага краязнаўчага музея, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь.*